**Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь**

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы **для дыпламатычных работнікаў Міністэрства замежных спраў** уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі серабрыстага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

Усе элементы крыжа абрамлены кантам серабрыстага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – квадрат серабрыстага колеру, які пастаўлены на вугал і дэкарыраваны васьмю квадратамі серабрыстага колеру: па адным на кожнай з яго вяршынь і па два на верхніх старанах. На бакавыя і ніжні канцы крыжа накладзены галіны каралеўскай папараці серабрыстага колеру, паверх якіх размешчана дугападобная планка з надпісам ”МЗС БЕЛАРУСІ“ серабрыстага колеру.

Прамы роўнаканцовы клінчата-вырубны крыж у сваёй ізаграфіі аналагічны ўзору беларускага арнаменту - крыжа «Васьмірог» («беларуская зорка»), які азначае паняцце «Чалавек-Жыццё», што сугучна ідэалогіі беларускай дзяржавы ў кантэксце эмблемы: «Годнае Жыццё Чалавека ў годнай Краіне».

Узор беларускага арнаменту мае тысячагадовую гісторыю, што падкрэслівае старажытную культуру і багатую гісторыю беларусаў, іх самасвядомасць і ўпэўненасць у сваім гістарычным выбары. Чырвоны, зялёны і белы колеры тоесныя колерам Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Шэры, белы і чырвоны колеры сугучныя народнай культуры беларусаў – колеру лёну, палатна, вышыўкі нацыянальных касцюмаў.

У цэнтры знака – стылізаваная кветка Каралеўскай папараці, які абрамлены яго галінкамі. Каралеўская папараць – расліна, якая ўнесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, з’яўляецца прататыпам чароўнай кветкі «Папараць-кветка» – распаўсюджанага вобраза ў беларускім фальклоры. Па народных павер'ях, асоба, якая знайшла чароўную кветку (красуе адну ноч у годзе) надзяляецца дзіўнымі якасцямі разумець думкі людзей, галасы птушак і жывёл, знаходзіць багацце і скарбы. У кантэксце сімволікі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Каралеўская папараць – ключ да ўзаемаразумення паміж людзьмі і краінамі.

Нагрудны знак адрознення органаў дыпламатычнай службы **для дыпламатычных работнікаў, якія маюць дыпламатычныя рангі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка першага класа, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасланніка другога класа**, уяўляе сабой выяву прамога роўнаканцовага клінчата-вырубнога крыжа з плоскасцямі

чырвонага і справа ўнізе зялёнага колеру, які падзелены ўздоўж бакоў палоскамі серабрыстага колеру. Паміж слупоў і перакладзін крыжа размешчаны квадраты чырвонага колеру, па вонкавым краі крыжа – квадраты серабрыстага колеру.

Усе элементы крыжа абрамлены кантам серабрыстага колеру. Плоскасці чырвонага і зялёнага колеру дэкарыраваны адпаведна праменямі цёмна-чырвонага і цёмна-зялёнага колеру, якія радыяльна разыходзяцца ад цэнтра. У цэнтры крыжа – круг чырвонага колеру з кантам і контурнай выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь серабрыстага колеру.

Крыж размешчаны на галінах каралеўскай папараці серабрыстага колеру, па-за якімі – стужкі з беларускім арнаментам серабрыстага колеру.